**Лазюк, А.** Прапаўшы подзвіг? / А. Лазюк // Голас Сенненшчыны. — 2014. — 15 лют. — С. 1, 3.

# ПРАПАЎШЫ ПОДЗВІГ?

***Сёння – 25 гадоў з той пары, як з Афганістана, пасля больш чым 9-гадовага знаходжання, быў выведзены «абмежаваны кантынгент савецкіх войскаў». Удзельнікамі той неаб'яўленай вайны сталі, згодна з афіцыйнымі дадзенымі, 525,5 тыс. ваеннаслужачых (у тым ліку – 62,9 тыс. афіцэраў), 69 тыс. пагранічнікаў і супрацоўнікаў КДБ, 9 тыс. міліцыянераў, больш за 21 тыс. рабочых і служачых Савецкай Арміі.***

Многіх з іх родныя жывымі не дачакаліся. У ліку загінуўшых – 751 наш суайчыннік. Загінулі і ўраджэнцы Сенненшчыны: Аляксандр Галькевіч, Віктар Русачэнка, Васіль Стаселька.

Аляксандр Звярковіч на афганскай вайне прапаў без вестак. Радавы дэсантна-штурмавога батальёна знік з паста. Здарылася гэта 7 красавіка 1984 года.



## Мацярынскае сэрца

Саша Звярковіч нарадзіўся ў вёсцы Маргойцы. Як успамінаюць яго аднагодкі, настаўнікі Беліцкай СШ, хлопец нічым асаблівым не вылучаўся. Але характар, у ім адчуваўся з дзяцінства. Пасля заканчэння школы Саша падаўся ў Мінск, скончыў ПТВ. А хутка яго прызвалі ў войска для праходжання абавязковай ваеннай службы.

Палітычны каляндар дзяржавы, якая займала шостую частку тэрыторыі планеты, адлічваў гады, названыя пазней «застойнымі». Тым не менш, запіс у картцы ўліку вайскоўца «прапаў без вестак» успрымаўся дзяржаўнымі службоўцамі, супрацоўнікамі спецслужбаў амаль што як дэзерцірства.

«Прыязджалі з міліцыі, ваенкамата, нейкія людзі ў цывільным распытвалі пра Сашу ў нас, у суседзяў. Можа дзе хаваецца?» – расказвае са слязамі на вачах маці Аляксандра Звярковіча Софія Андрэеўна. Яна і зараз жыве ў Маргойцах. Крыўда, нанесеная падазрэннямі, не забыта: «Гэта ж трэба, што выдумалі – як ён мог з таго Афганістана дабрацца ў Маргойцы, калі б і выжыў?»

Пазней, калі высветлілася, што Аляксандр Звярковіч застаўся верны прысязе, не перайшоў на бок душманаў, Софію Андрэеўну з сынам Міхаілам запрашалі ў Маскву, на сустрэчу грамадскай арганізацыі, якая імкнулася дамагчыся ўстанаўлення помніка салдатам загінуўшым, прапаўшым у Афганістане без вестак. «Я разумела, што гэтыя намаганні пустыя, бесперспектыўныя, але спадзявалася – раптам пра Сашу новае што пачую», – слёзы душаць Софію Андрэеўну. Душэўная

рана маці, якая страціла дзіця, не загоіцца ніколі. А калі яе пастаянна бярэдзіць, боль становіцца невыноснай, бясследна не праходзіць. Нядаўна Софія Андрэеўна перанесла інсульт.


СЕННЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ВОЕННЫЙ КОМИССАРИАТ

СПРАВКА

Дана настоящая ЗВЕРКОВИЧ Анатолию Карповичу в том, что его сын ЗВЕРКОВИЧ Александр Анатольевич 1964 года рождения пропал без вести 7 марта 1984 года при исполнении обязанностей военной службы.

ОСНОВАНИЕ: Извещение командира войсковой части 53701.

СЕННЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ВОЕННЫЙ КОМИССАР
ПОДПОЛКОВНИК «ГРАЧЕВ»

Пошукі салдат, прапаўшых без вестак у Афганістане, працягваюцца. Аднойчы ў дом Софіі Звярковіч завіталі незнаёмыя людзі і без доўгіх цырымоній паклалі на стол … чэрап: «Гэта рэшткі вашага сына, можаце іх пахаваць. І пастаўце подпіс, што вам іх перадалі». Падпісваць паперы жанчына катэгарычна адмовілася. А вось здаць біялагічны матэрыял, каб правесці генетычную экспертызу, яна пагадзілася. Толькі вось вынікі даследаванняў Звярковічам невядомы да гэтага часу…

**Табе не здрадзілі, Радзіма**



На постсавецкай прасторы добра вядомы ансамбль «Голубые береты». У рэпертуары музыкаў шмат песень, прысвечаных афганскай тэматыцы. Адна – памяці ваеннапалонных, якія ў 1985 годзе ўзнялі паўстанне ў лагеры Бадабер, які знаходзіўся на тэрыторыі Пакістана. Тут на плошчы ў 500 га, жыло каля 11 тыс. афганскіх бежанцаў. Бадабер быў буйнешым вучэбным цэнтрам узброеных фарміраванняў аднаго з лідараў баевікоў Рабані. На тэрыторыі лагера знаходзіліся 6 складоў са зброяй і боепрыпасамі, 3 падземныя турэмныя памяшканні, дзе ўтрымліваліся 40 афганскіх і 12 савецкіх ваеннапалонных. «Шураві» трымалі ў кайданах,

выкарыстоўвалі для працы ў каменаломнях, для разгрузкі боепрыпасаў і здзекаваліся. Хлопцы трывалі, пакуль хапала цярпення.

Што здарылася потым, можна даведацца з розных крыніц у інтэрнэце. Шмат пісалася пра тыя падзеі ў расійскіх, украінскіх СМІ. Былі публікацыі і ў беларускіх выданнях.

… Красавіцкім вечарам палонныя забілі двух паставых (астатнія, склаўшы зброю, маліліся), захапілі арсенал і сталі рыхтавацца да бою. Што імі рухала: адчай, роспач? Ці ўсё ж была надзея, шанц вырвацца жывымі з пекла? Пра гэта мы ўжо не даведаемся ніколі. Дакладна вядома, што сярод паўстанцаў знайшоўся здраднік, афганец, які збег з крэпасці і паведаміў пра падрыхтоўку.

Бой пачаўся вечарам і ішоў усю ноч. Раніцай маджахеды Рабані разам з рэгулярнымі пакістанскімі ваеннымі часцямі пайшлі на штурм. Выкарыстоўвалася авіяцыя. Радыёразведцы 40-й савецкай арміі ўдалося зафіксаваць перамовы паміж пакістанскімі лётчыкамі і авіябазай, даклад аднаго з лётчыкаў пра нанясенне бомбавага ўдару па крэпасці. Відаць, у выніку гэтага адбылася дэтанацыя складскіх боепрыпасаў. Асколкі разляталіся на адлегласць больш за кіламетр. Загінулі 120 маджахедаў, 6 замежных саветнікаў, 13 прадстаўнікоў пакістанскіх улад. Разам з імі – ваеннапалонныя. Гэта стала вядома ў 1992 годзе, калі намеснік міністра замежных спраў Пакістана Шахрыяр Хан перадаў іх спіс.

Менавіта пасля тых падзей пад Пешаварам з’явіўся загад: «Шураві ў палон не браць».

Подзвіг Аляксандра Звярковіча ў Беларусі фактычна не адзначаны. Яго імя няма нават на помніку воінам-інтэрнацыяналістам у Віцебску. У абласным ваенкамаце наш зямляк, па-ранейшаму, знаходзіцца ў спісе прапаўшых без вестак. Праўда, указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандр Звярковіч узнагароджаны медалём «У памяць 10-годдзя вываду савецкіх войскаў з Афганістана» – пасмяротна. Іншай узнагароды за ваенныя дзеянні савецкага перыяду нашым заканадаўствам не прадугледжана.

Не прадугледжана – і не трэба. Не трэба, нават, родным. Любы напамін пра Сашу – гэта чарговая стрэмка ў сэрца маці і брата. А вось страты грамадства, якое выкрэсліла з памяці героя, краіны, што не так даўно набыла дзяржаўнасць, ад бяспамяцтва невымерныя. Яны не матэрыяльныя, яны маральныя, духоўныя.

***Аляксандр Лазюк***